# ВЁСКА ЛІТАРАТУРНАЯ

***Як ні сумна аб гэтым гаварыць, але ў наш час так мала ведаюць аб жыцці і творчасці беларускіх пісьменнікаў.***

У сельскай бібліятэцы прайшла літаратурная гадзіна, прысвечаная дню нараджэння айчыннага драматурга Андрэя Макаёнка. Да юбілейнай даты аформілі выставу з біяграфічным фоталетапісам пісьменніка. Мясцовы краязнаўца Сцяпан Нефідовіч расказаў, што літаратар часта бываў у вёсцы. Таксама вучні даведаліся аб выступленнях знакамітага Купалаўскага тэатра на сцэне мясцовага Дома культуры. Затым прайшла прэзентацыя зборніка С.П. Нефідовіча «Іх яднала дружба» пра жыццёвы шлях А.Я. Макаёнка і У.А. Сцепчанкі.

**Наталля КІПЦЭВІЧ, дырэктар Любанскага СДК,**
**Кацярына РУДЗЬКО, бібліятэкар.**